FACTSHEET

# Навошта нам Стамбульская канвенцыя?

## Інфармацыйны бюлетэнь: міфы і памылковыя ўяўленні

У наступным інфармацыйным бюлетэні выкладзеныя некаторыя распаўсюджаныя міфы і памылковыя ўяўленні, звязаныя з Канвенцыяй Рады Еўропы аб прадухіленні гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту і барацьбе з гэтымі з'явамі (Стамбульская канвенцыя). Гэтым павінны карыстацца арганізацыі грамадзянскай супольнасці (АГС) пры распрацоўцы сваіх камунікацыйных/асветніцкіх кампаній для прасоўвання каштоўнасцей, мэт і асноўных палажэнняў Канвенцыі. Гэты спіс не з'яўляецца вычарпальным, і АГС рэкамендуецца звярнуць увагу на іншыя міфы, звязаныя са Стамбульскай канвенцыяй, з якімі яны сутыкаюцца, і падумаць, як з імі змагацца. Каб яшчэ больш падкрэсліць сапраўдныя мэты Канвенцыі, кожны факт, які развенчвае міф, павінен быць адаптаваны да нацыянальнага кантэксту, а прапановы выдзеленыя курсівам. Гэтыя факты могуць суправаджаць асноўныя паведамленні, прызначаныя для распаўсюджання па розных каналах камунікацыі, або могуць выкарыстоўвацца АГС у якасці ўнутранага брыфу падчас размоваў з асобамі, якія прымаюць рашэнні, каб падкрэсліць мэты і важнасць Стамбульскай канвенцыі.

---

### МІФ.

Стамбульская канвенцыя - гэта замежны дакумент, навязаны Еўропай.

### ФАКТ.

Стамбульская канвенцыя была ўзгодненая міністрамі замежных спраў 47 дзяржаў-удзельніц Рады Еўропы (цяпер іх 46) пасля працяглых абмеркаванняў; у ёй удзельнічала кожная краіна.

*Дадаць (калі адпавядае):*

*Падкрэсліце, што ваша краіна была адным з аўтараў Стамбульскай канвенцыі і падпісала/ратыфікавала яе без знешняга ціску. Пакажыце, калі ваша краіна ўступіла ў Раду Еўропы, каб давесці, што яна была паўнапраўнай удзельніцай.*

---

### МІФ.

Стамбульская канвенцыя ўводзіць у нацыянальнае заканадаўства паняцце «гендар».

## ФАКТ.

Стамбульская канвенцыя дапамагае нам зразумець, што гвалт, які мужчыны здзяйсняюць у адносінах да жанчын – гэта шматфактарная з'ява. На яе ўплываюць сацыяльныя ўстаноўкі адносна таго, як павінны сябе паводзіць мужчыны і жанчыны - што ўважаецца прымальным для мужчын, а што - для жанчын. Гэтыя падыходы вызначаюць нашу рэакцыю на гвалт і ўплываюць на тое, як мы разглядаем гвалт у адносінах да жанчын і дзяўчатак. Тэрмін «гендар» вызначае гэтыя паняцці, і таму ён выкарыстоўваецца ў Стамбульскай канвенцыі. Гэта не азначае, што нацыянальнае заканадаўства і палітыка павінны вызначаць гендар, але яны павінны быць распрацаваныя з улікам гендарнай ідэнтычнасці.

*Дадаць (калі адпавядае):*

*Назавіце нацыянальныя законы, якія тычацца дыскрымінацыі і роўных правоў мужчын і жанчын.*

---

## МІФ.

Стамбульская канвенцыя накіраваная на рэгуляванне сямейнага жыцця або структуры сям'і і вядзе да разбурэння традыцыйнай сям'і.

## ФАКТ.

Стамбульская канвенцыя накіраваная на захаванне бяспекі сем'яў шляхам абароны жанчын і дзяўчатак ад хатняга гвалту, гэтак жа як яна накіраваная на захаванне бяспекі жанчын і дзяўчатак па-за межамі сям'і. Для Канвенцыі не мае значэння, як выглядае сям'я. Што мае значэнне ў адпаведнасці з Канвенцыяй – гэта прадухіленне хатняга гвалту і іншых формаў гвалту, абарона і падтрымка жанчын і іх дзяцей, прыцягванне злачынцаў да адказнасці, шляхам далучэння ўсіх да працэсу, каб у выніку ўсе знаходзіліся ў бяспецы. Стамбульская канвенцыя мае за мэту спыненне ўсіх формаў дыскрымінацыі жанчын. Яна спрыяе роўнасці паміж жанчынамі і мужчынамі, даючы жанчынам магчымасць распараджацца ўласным жыццём і права рабіць уласны выбар і прымаць рашэнні. Канвенцыя дасягае гэтага, абапіраючыся на комплексную аснову, якая (1) ахоплівае палітыку і меры па абароне і дапамозе ўсім ахвярам, (2) спрыяе міжнароднаму супрацоўніцтву і (3) падтрымлівае супрацоўніцтва паміж праваахоўнымі органамі і арганізацыямі, якія змагаюцца з гвалтам у адносінах да жанчын.

*Дадаць (калі адпавядае):*

*Адзначце, што Стамбульская канвенцыя не накіраваная на знішчэнне традыцыйнай сям'і ў вашай краіне, а імкнецца парушыць маўчанне пра гвалт у сем'ях, які прыносіць пакуты ахвярам, у тым ліку дзецям.*

*Падкрэсліце, што рэальнай пагрозай для сем'яў з'яўляецца сам гвалт, а не меры, накіраваныя на абарону і падтрымку яго ахвяр.*

## МІФ.

Канвенцыя імкнецца «ліквідаваць адрозненні» паміж жанчынамі і мужчынамі і адмаўляе іх адрозненні.

## ФАКТ.

Стамбульская канвенцыя не імкнецца ліквідаваць адрозненні паміж жанчынамі і мужчынамі і не мае на ўвазе, што жанчыны і мужчыны з'яўляюцца аднолькавымі або павінны быць такімі. У ёй гаворыцца, што жанчыны і мужчыны маюць роўныя правы. Гэта інструмент, спецыяльна распрацаваны для абароны права жанчын на бяспеку.

*Дадаць (калі адпавядае):*

*Назавіце нацыянальнае заканадаўства, якое ўжо дзейнічае для барацьбы з гендарнай няроўнасцю і сексізмам ў вашай краіне. Адзначце, што гэта адпавядае мэтам Стамбульскай канвенцыі.*

---

## МІФ.

Канвенцыя супярэчыць нацыянальным рэлігійным традыцыям і рэлігіі.

## ФАКТ.

Канвенцыя не датычыцца рэлігіі ці веры. У ёй гаворыцца, што культура, звычаі, рэлігія, традыцыі або так званы «гонар» не павінны выкарыстоўвацца для апраўдання ніякага акту гвалту, напрыклад, калецтва жаночых палавых органаў або прымусовага шлюбу. Стамбульскую канвенцыю ратыфікавалі шэраг краін з моцнымі рэлігійнымі традыцыямі, у тым ліку Сербія, Грэцыя, Кіпр, Чарнагорыя, Грузія, Гішпанія, Сан-Марына і Італія.

*Дадаць (калі адпавядае):*

*Падкрэсліце, што ў адпаведнасці з канстытуцыяй вашай краіны царква і рэлігійныя арганізацыі аддзеленыя ад дзяржавы.*

*Падкрэсліце, што кожны ў грамадстве мае права на свабоду думкі і рэлігіі, гэтак жа як кожны ў грамадстве мае права на бяспеку і абарону.*

## МІФ.

Канвэнцыя ўводзіць у нацыянальнае заканадаўства аднаполыя шлюбы, а таксама паняцьці «сэксуальная арыентацыя» і «гендарная ідэнтычнасьць».

## ФАКТ.

Стамбульская канвенцыя гарантуе, што там, дзе яна рэалізуецца, гэта адбываецца без ніякай дыскрымінацыі паводле гендарнай ідэнтычнасці чалавека або яго сексуальнай арыентацыі. Для таго, каб атрымаць абарону ад гвалту, не павінна мець значэння, каго вы кахаеце. Многія дзяржавы, якія не прызнаюць аднаполыя шлюбы, ужо ратыфікавалі канвенцыю, напрыклад, Албанія, Боснія і Герцагавіна, Грузія, Польшча, Румынія і Сербія.

*Дадаць (калі адпавядае):*

*Падкрэсліце, што тэрміны «сексуальная арыентацыя» і «гендарная ідэнтычнасць» ужо ўключаныя ў нацыянальнае заканадаўства, і пакажыце асобныя артыкулы ў законе, якія тычацца дыскрымінацыі і раўнапраўя.*

---

## МІФ.

Канвенцыя абараняе толькі жанчын і дае ім прывілеі.

## ФАКТ.

Стамбульская канвенцыя засяроджаная на жанчынах і дзяўчатках, таму што яна ахоплівае тыя формы гвалту, ад якіх пакутуюць толькі жанчыны (прымусовыя аборты, калечанне жаночых палавых органаў) або з якімі жанчыны сутыкаюцца значна часцей за мужчын (сексуальны гвалт і згвалтаванне, пераследаванне, сексуальныя дамаганні, хатні гвалт, прымусовы шлюб, прымусовая стэрылізацыя). Тым не менш, Канвенцыя заахвочвае прымяненне яе палажэнняў на карысць усіх ахвяр хатняга гвалту, у тым ліку мужчын і дзяцей.

*Дадаць (калі адпавядае):*

*Скарыстайцеся нацыянальнай статыстыкай, каб паказаць, што большасць ахвяр хатняга гвалту і/ці згвалтаванняў складаюць жанчыны, і падкрэсліце, што большасць жанчын у вашай краіне сутыкаюцца з той ці іншай формай гвалту на працягу жыцця.*

*Пры наяўнасці адпаведнай статыстыкі пазначце, як павялічылася колькасць зарэгістраваных скаргаў на хатні і/або сексуальны гвалт, а таксама працэнт скаргаў, якія паступаюць ад жанчын, у параўнанні з папярэднімі гадамі (у сувязі з COVID 19).*

## МІФ.

Канвенцыя заклікае дзяржавы ўмешвацца ў адукацыйны працэс.

## ФАКТ.

Стамбульская канвенцыя ўважае, што адукацыя з'яўляецца важным аспектам прадухілення гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту, таму што погляды, перакананні і мадэлі паводзін фармуюцца вельмі рана ў жыцці. Навучанне таму, што хлопчыкі і дзяўчаткі - роўныя і павінны мець роўныя магчымасці, можа паспрыяць выкараненню ў будучыні мадэляў паводзін, якія вядуць да гвалту.

Тым не менш, кожная дзяржава сама вызначае, калі і як вырашаць праблемы роўнасці жанчын з мужчынамі, узаемнай павагі і адмовы ад гвалту, а таксама калі і як пачынаць гаворку пра розныя формы гвалту супраць жанчын у фармальных і нефармальных адукацыйных установах. Навучыць дзяцей пазнаваць і адпрэчваць гвалт і прымус у адносінах да жанчын і дзяўчатак, сведкамі якога яны становяцца – у школе, на дварэ, у сям'і - гэта першы крок у выхаванні пакалення, свабоднага ад гвалту.

*Дадаць (калі адпавядае):*

*Калі магчыма, спашліцеся на любыя якасныя або колькасныя даследаванні, якія паказваюць, наколькі моцна адукацыя, якую атрымліваюць дзеці, уплывае на іх успрыняцце сябе і сваіх аднагодкаў, і на тое, што яны ўважаюць за прымальныя паводзіны. Прывядзіце прыклады многіх краін, якія прымаюць прэвентыўныя меры, такія як навучанне дзяцей пра праблему цкавання ў інтэрнэце.*

---

## МІФ.

У вашай краіне ўжо існуе нацыянальнае заканадаўства па прадухіленні гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту, таму Стамбульская канвенцыя непатрэбная.

## ФАКТ.

Краіна, якая прымае Стамбульскую канвенцыю, паказвае сваю рашучасць у справе спынення гвалту, далучаючыся да сістэмы, якая рэгулюецца міжнародным правам. Гэты крок значыць больш, чым змена законаў - ён прадугледжвае аб'яднанне намаганняў для павышэння інфармаванасці; збор дадзеных і даследаванні; забеспячэнне фінансавання паслуг для пацярпелых; ліквідацыя прабелаў у службах падтрымкі; забеспячэнне доступу да правасуддзя; падрыхтоўка спецыялістаў; і іншыя важныя элементы, неабходныя для спынення гвалту. Канвенцыя дапамагае ўрадам правільна рэагаваць на ўсе формы гвалту і распаўсюджваецца на ўсіх жанчын і дзяўчатак, незалежна ад таго, хто яны і адкуль яны паходзяць. Гэта ўсеабдымны пералік мер, апрабаваных у іншых краінах. Гэта ясна паказвае, што гвалт у адносінах да жанчын і хатні гвалт больш не можа разглядацца як прыватная справа, і што дзяржавы павінны заняць цвёрдую пазіцыю і прыняць меры для прадухілення гвалту, абароны пацярпелых і пакарання злачынцаў.

*Дадаць (калі адпавядае):*

*Прыклады зменаў, унесеных у нацыянальнае заканадаўства вашай краіны для абароны жанчын ад гвалту.*

*У працяг гэтага патлумачце, што хоць гэтыя змены і ёсць добрым пачатковым крокам, наяўнасць нацыянальнага заканадаўства сама па сабе не з’яўляецца аргументам супраць міжнароднай канвенцыі, якая ўсталёўвае правілы, якія ўзгадняюцца і выконваюцца многімі краінамі на міжнародным узроўні. Напрыклад, Канвенцыя ахоплівае сферы нацыянальнага заканадаўства і практыкі, якія патрабуюць паляпшэння, забяспечвае рэгулярны міжнародны абмен практыкамі і падыходамі для іх больш эфектыўнай рэалізацыі, а таксама прадстаўляе знешніх экспертаў, якія могуць накіроўваць і рэкамендаваць шляхі больш эфектыўнага прадухілення гвалту, абароны пацярпелых і судовага пераследу злачынцаў.*

*Найбольш важна падкрэсліць, што, ратыфікаваўшы Стамбульскую канвенцыю, ваша краіна дашле міжнароднай супольнасці моцны сігнал аб сваёй заангажаванасці ў барацьбу за спыненне ўсіх формаў гвалту ў адносінах да жанчын. Гэта таксама ўратоўвае іх жыцці.*

---

Гэты інфармацыйны бюлетэнь складаецца з адаптаванага праекту бюлетэня для 16-дзённай акцыі супраць гендарнага гвалту і хатняга гвалту. Для атрымання дадатковай інфармацыі, гл. Канвенцыю Рады Еўропы аб прадухіленні гвалту ў адносінах да жанчын і хатняга гвалту і барацьбе з гэтымі з’явамі (Стамбульская канвенцыя): пытанні і адказы https://rm.coe.int/istanbul-convention-questions-and-answers/16808f0b80

Гэтая брашура была падрыхтаваная WAVE (“Жанчыны супраць гвалту ў Еўропе”) як частка інструментарыя Рады Еўропы для распрацоўкі камунікацыйных/асветніцкіх кампаній для прасоўвання каштоўнасцей, мэт і асноўных палажэнняў Стамбульскай канвенцыі. Змест гэтай публікацыі з’яўляецца выключнай адказнасцю аўтараў і ні ў якім разе не адлюстроўвае погляды Рады Еўропы або арганізацыі “ААН-Жанчыны”. Гэтая публікацыя падрыхтавана пры фінансавай падтрымцы Рады Еўропы і ў супрацоўніцтве з “ААН-Жанчыны”.

PREMS 131723

COUNCIL OF EUROPE

CONSEIL DE L’EUROPE